

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №2 (10)
Лістапад - снежань 2020

## У нумары:

**З надыходзячым Новым годам і Калядамі!**
Віншаванне адміністрацыі і прафкама ўстановы адукацыі **Стар. 1**

**Аздараўленчы лагер “Вясёлка”** **Стар. 2**

**Сусветны тыдзень рацыянальнага выкарыстання антыбіётыкаў** **Стар. 2**

**Тыдзень энергазберажэння** **Стар. 3**

**Акцыя “Зробім кармушку разам”** **Сіар. 4**

**Шосты школьны дзень** **Стар. 5**

## З надыходзячым Новым годам і Калядамі!




***Паважаныя сябры і калегі!***

Сардэчна і шчыра віншуе Вас з Новым годам і Калядамі!

Няхай наступаючы 2021 год стане для Вас годам здзяйснення самых грандыёзных планаў, прынясе поспех ва ўсіх справах і пачынаннях, стабільнасць і дабрабыт.

Здароўя і шчасця Вам і Вашым блізкім, радасці і аптымізму, дабра і міру!

*Адміністрацыя і прафкам установы адукацыі*

## З НОВЫМ 2021 ГОДАМ!!!

# Аздараўленчы лагер “Вясёлка”

У перыяд восеньскіх канікул з 31 кастрычніка па 06 лістапада ва ўстанове адукацыі працаваў аздараўленчы лагер "Вясёлка", які наведвалі 11 навучэнцаў школы. Хлопцы весела і з карысцю праводзілі час: рабілі восеньскія падзелкі, удзельнічалі ў віктарынах і конкурсах, спартыўных мерапрыемствах, гулялі на свежым паветры.








# Сусветны тыдзень рацыянальнага выкарыстання антыбіётыкаў




Пачынаючы з 2015 года па ініцыятыве Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў лістападзе праводзіцца Сусветны тыдзень рацыянальнага выкарыстання антыбіётыкаў. У бягучым годзе Сусветны тыдзень рацыянальнага выкарыстання антыбіётыкаў праходзіць у Беларусі з 11 па 17 лістапада.

Мэта дадзенага тыдня - павысіць дасведчанасць людзей аб праблеме ўстойлівасці да антыбіётыкаў і заахвоціць шырокую грамадскасць, спецыялістаў розных сфер (аховы здароўя, сельскай гаспадаркі і харчавання, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя) прымяняць перадавыя падыходы, якія дазваляюць не дапусціць яе далейшага развіцця і распаўсюджвання.

**Што кожны можа зрабіць для прадухілення распаўсюджвання ўстойлівасці да антыбіётыкаў?**

Зрабіць можна наступнае: - прымаць антыбіётыкі толькі па прызначэнні кваліфікаванага работніка аховы здароўя; - ніколі не патрабаваць антыбіётыкаў, калі, па словах медработніка, у іх няма неабходнасці; - заўсёды выконваць рэкамендацыі медработніка пры выкарыстанні антыбіётыкаў; - ніколі не даваць свае антыбіётыкі іншым асобам ці не выкарыстоўваць тыя, што засталіся.

# Тыдзень энергазберажэння

## Тэматычная выстава праектаў на французскай мове "З павагай да энергазберажэння"







11 лістапада ў школе была арганізавана і праведзена тэматычная выстава праектаў на французскай мове "З павагай да энергазберажэння", прымеркаваная да Міжнароднага дня энергазберажэння. У падрыхтоўцы і правядзенні дадзенай выставы прынялі ўдзел 17 вучняў 5-9 класаў. Кіраўнік праекта - Баркоўская Г.І., настаўнік французскай мовы.

Дзень энергазберажэння - гэта выдатная нагода яшчэ раз пагаварыць пра энергаэфектыўныя тэхналогіі, важнасць выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі, спосабы энергазберажэння дома. А лепш не толькі пагаварыць, але і прымяніць атрыманыя веды на практыцы. Напрыклад, не пакідаць электрапрыборы, уключанымі ў рэжыме чакання, замяніць лямпачкі ў кватэры на энергазберагальныя, выключаць ваду ў працэсе чысткі зубоў, карыстацца душам замест ванны і г.д.

## Навіны дзіцячага сада

У рамках Тыдня энергазберажэння і праекта "Азбука Берагошы” 12 лістапада для выхаванцаў дзіцячага садка былі арганізаваны і праведзены наступныя мерапрыемствы: гутаркі: "Цяпло вакол нас", "Для чаго трэба электрычнасць", "Як мы зможам зберагчы цяпло ў нашых групах"; конкурс малюнкаў для старэйшай групы "Энергазберажэнне вачыма дзяцей".

Дадзеныя мерапрыемствы спрыяюць разуменню дзецьмі таго факту, што рэсурсы нашай планеты не бязмежныя, і мы павінны з розумам ставіцца да іх выкарыстання, каб Зямля заставалася такой жа прыгожай, як і цяпер.







# Акцыя "Зробім кармушку разам!"

Выхаванцы рознаўзроставай групы дзіцячага сада сумесна з выхавальнікам Пратасевіч Святланай Сяргееўнай прынялі ўдзел у акцыі "Зробім кармушку разам!".

Дзеці зразумелі важную рэч: робячы кармушкі, яны дапамагаюць птушкам выжыць у халодную пару года.

Клопат пра птушак - выдатная магчымасць вывучэння жывой прыроды і навакольнага свету, выдатны ўрок міласэрнасці.








# Аб’ява!!!




**Да ўвагі навучэнцаў і іх бацькоў!**

З 26 снежня па 5 студзеня ўключна ў школе будзе працаваць школьны аздараўленчы лагер “Снегавічок” з дзённым наведваннем. На працягу зімовых канікул дзяцей чакае маса пазнавальных і займальных мерапрыемстваў і забаў. Час пройдзе з карысцю і з добрым настроем !!!

За падрабязнай інфармацыяй звяртайцеся да класных кіраўнікоў.

# Шосты школьны дзень

## Выстава "Страшнае слова СНІД"

28 лістапада ў бібліятэцы школы адбылася выстава кніг і брашур на тэму "Страшнае слова СНІД". Дадзенае мерапрыемства прымеркавана да Сусветнага дня барацьбы са СНІДам, які штогод адзначаецца 1 снежня.

Кніжную выставу наведалі вучні 7-9 класаў. Падчас мерапрыемства была абмеркаваня праблема распаўсюджвання і заражэнні ВІЧ-інфекцыяй. Акрамя таго, вучні падрыхтавалі плакаты "Мы за здаровы лад жыцця" і "Мы супраць СНІДу". Мерапрыемства было пазнавальным і павучальным для школьнікаў.





## Выстава музейных экспанатаў "Самы стары экспанат"

У шосты школьны дзень 5 снежня 2020 года ва ўстанове адукацыі прайшла выстава музейных экспанатаў "Самы стары экспанат".

На выставе былі прадстаўлены тканыя вырабы, выробленыя больш за 100 гадоў таму: ільняныя ручнікі, пакрывалы, абрус. Таксама былі прадстаўлены навагоднія елачныя ўпрыгажэнні эпохі СССР, зробленыя з каляровага шкла. Асаблівае месца сярод выставачных экспанатаў занялі часопісы "Сялянка", "Работніца і сялянка" 1951, 1953, 1961 гадоў выпуску. Дзякуючы гэтым друкаваным выданням вучні зрабілі невялікі экскурс па асноўным важным гістарычным падзеям той эпохі.










Рэдкалегія: вучні 9 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 9 класа.
Газета выходзіць 1 раз у 2 месяцы.
Наступны нумар выйдзе 27 лютага.